УДК 378 : 001.1

**Смалянка Г.А.,** старшы выкладчык
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# СУМЕСНАЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ПРАЦА ВЫКЛАДЧЫКА І СТУДЭНТА – АСНОВА ФАРМІРАВАННЯ НАВУКОВАГА СВЕТАПОГЛЯДУ БУДУЧЫХ ВЫПУСКНІКОЎ

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаецца сумесная навукова-даследчая праца выкладчыка і студэнта, аналізуюцца прынцыпы арганізацыі работы. Увага засяроджана на пошукавай дзейнасці выкладчыка.*

Адной з актуальных праблем сацыяльнага, культурнага, духоўнага развіцця грамадства з'яўляецца пытанне аптымізацыі і ўдасканалення сістэмы вышэйшай адукацыі.

Выпускнік установы вышэйшай адукацыі павінен валодаць не толькі прафесійнымі ведамі, навыкамі і ўменнямі, якія садзейнічаюць пасяховасці будучай прафесійнай дзейнасці, але і мець шырокі кругагляд, сфарміраваны светапогляд, быць па-сапраўднаму сфарміраванай у духоўным і фізічным плане асобай. «Сапраўднага чалавека», на думку В.А.Сухамлінскага, адрознівае «... імкненне жыць у свеце думкі…» Паніжэнне іміджу адукацыі, матывацыі студэнтаў да навучання, даступнасць і масавасць адукацыі, недастатковы ўзровень падрыхтаванасці да навучання дэтэрмініруюць недастатковы ўзровень самастойнасці і адказнасці маладых людзей, іх безыніцыятыўнасць, выбар лёгкадасягаемых, малазначных мэтаў, што у сукупнасці не дазваляе ім у будучым быць сапраўднымі прафесіяналамі, канкурэнтназдольнымі на рынку прафесій. Вырашэнне вышэй названых пытанняў залежыць як ад студэнтаў, так і ад выкладчыкаў.

Распрацоўка і ўкараненне сучасных педагагічных тэхналогій, прымяненне інавацыйных падыходаў у адукацыі, выкарыстанне інфармацыйных сродкаў камунікацыі дазваляюць выкладчыкам, павышаючы свае педагагічнае майстэрства, уздзейнічаць на асобу



Рэпазіторый БГАТУ

студэнта. Аднак, асноўнай, на наш погляд, павінна з'яўляцца пошукавая дзейнасць выкладчыка, якая садзейнічае набыццю, новых ведаў, фарміраванню матывацыйнай сферы навучэнцаў, уздзейнічае на асобу студэнта. У якасці такой дзейнасці выкладчыка (як і студэнта) можа выступаць навукова–даследчая праца. Прымяненне любых метадаў даследавання пазітыўна выяўляецца на эфектыўнасці адукацыйнага працэсу. Пастаянны навуковы пошук дазваляе валодаць інфармацыяй аб сучасным становішчы спраў у той ці іншай галіне ведаў, актуальных праблемах, патрабуючых вырашэння ў сістэмна-гістарычным аспекце даследуемага пытання. Тэарэтыка-бібліяграфічны аналіз, сацыялагічныя метады даследавання і інтэрпрэтацыя яго вынікаў, педагагічныя і лабараторныя эксперыменты дазваляюць выкладчыку самаўдасканальвацца, быць найбольш кампетэнтным у сваёй галіне ведаў, што і вызначае ўзровень яго педагагічнага ўздзеяння на студэнтаў.

Сумесная навуковая дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў, іх «першы крок у навуку» – ці не гэта аснова фарміравання пытлівага розуму, пошуку новых тэхналогій і вынаходніцтваў, да чаго і павінен быць падрыхтаваны будучы выпускнік, а не выкананне ім, няхай і паспяховае, вузканакіраваных прафесійных дзеянняў, сфарміраваных на набытых у час навучання ведах, навыках і ўменнях.

Навука ў ВНУ не прынясе імгненны эканамічны эфект, але яе прапагандаванае дзеянне выявіцца на адукацыйным працэсе, на яго канчатковым прадукце – ведах навучэнцаў, якія ў будучым прынясуць непараўнальна вялікія вынікі, што выражаюцца як у сацыяльным, так і эканамічным значэнні, так як не новыя тэхналогіі, новыя навуковыя адкрыцці, а толькі чалавечы патэнцыял з'яўляецца асноўнай рухаючай сілай на шляху да новых навуковых адкрыццяў, што робіць мінавіта педагагічную дзейнасць найбольш важнай у пошуку, падрыхтоўцы і адкрыцці новых талентаў.

**Abstract.** The article deals with the joint research work of the teacher and the student, the principles of the organization of work are analyzed. The focus is on the search activity of the teacher.



Репозиторий БГАТУ